Форум Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-10-04

# Кнігі «гасцявалі» ў Баку

Напрыканцы верасня ў сталіцы Азербайджана праходзіла III Бакінская міжнародная выстаўка-кірмаш, арганізаваная Міністэрствам культуры і турызму Азербайджанскай Рэспублікі.

Экспазіцыя беларусаў, прадстаўленая на пешаходнай вуліцы пад адкрытым небам, была накіравана на папулярызацыю айчыннага кнігавыдання і нашай культуры за мяжой. Усяго ў кніжным форуме ўдзельнічала 25 краін, сярод якіх — Расія, Казахстан, Турцыя, ЗША, Латвія, Эстонія, Румынія, Таджыкістан, Палесціна.

Падчас цырымоніі адкрыцця кірмашу міністр культуры і турызму Азербайджана Абульфаз Мурсал аглы Караеў адзначыў, што выстаўка з'яўляецца вынікам міжнароднай цікавасці да кніжнай справы ў краіне. Падобны форум будзе праводзіцца раз на два гады. Падчас работы выстаўкі міністр пазнаёміўся і са стэндам беларускіх кнігавыдаўцоў.

Намеснік дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Ала Корбут па запрашэнні азербайджанскага тэлебачання «AZ.TV» узяла ўдзел у «круглым стале», прысвечаным сумеснаму выдавецкаму праекту «Сугучча сэрцаў», распавяла пра гэты праект у інтэрв'ю тэлеканалу «Мир» і мясцовым радыёстанцыям, бліжэй пазнаёмілася з азербайджанскімі пісьменнікамі, чые творы ўвайшлі ў кнігу «Шчаслівая сустрэча» з серыі «Сугучча сэрцаў»: Анарам, Чынгізам Аліаглу, Націгам Расуладзэ, Эльчынам Гусейнбейлі і інш. Прадстаўніца Выдавецкага дома «Звязда» дамовілася пра сумесную працу са старшынёй Аб'яднання



*Намеснік дырэктара выдавецтва «БелЭн імя П. Броўкі» Вікторыя Калістратава, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Азербайджане Мікалай Пацкевіч, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Ала Корбут.*

азербайджанскіх выдаўцоў і паліграфістаў, генеральным дырэктарам выдавецтва *Tehil* Бахрузам Ахундавым, загадчыкам выдавецкага сектара Міністэрства культуры і турызму Азербайджана Чынгізам Аліаглу, прынамсі, азербайджанскі бок рыхтуецца да выдання анталогіі беларускай літаратуры па-азербайджанску.

Таксама адбыліся перамовы з пісьменнікамі, бібліятэкарамі краіны-гаспадыні выстаўкі, прадстаўнікамі Азербайджанскай нацыянальнай энцыклапедыі. У прыватнасці, адбылася сустрэча намесніка дырэктара выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вікторыі Калістратавай з віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Азербайджана, акадэмікам, дырэктарам навуковага цэнтра «Азербайджанская нацыянальная энцыклапедыя» Тофікам Муртуза аглы Нагіевым, яго намеснікамі — доктарам біялагічных навук, прафесарам Шангам Ібрагімавым і доктарам эканамічных навук Фамілам Фронт аглы Мустафаевым, падчас якой беларускі бок прапанаваў для разгляду праект «Энцыклапедычная бібліятэка кіраўнікоў краін СНД». Удзельнікам дэлегацыі былі перададзены тры тамы (у VIP-выкананні) Азербайджанскай энцыклапедыі для Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

Беларускія кнігавыдаўцы ўзялі ўдзел ва ўрачыстым закрыцці выстаўкі і былі адзначаны дыпломам. Нашы суайчыннікі вельмі плённа папрацавалі на прадстаўнічым форуме. Пацверджаны ранейшыя кантакты, наладжаны новыя сувязі з азербайджанскімі выдаўцамі і энцыклапедыстамі, вызначаны шляхі далейшага супрацоўніцтва.

**Раіса МАРЧУК**

Раіса Марчук. Кнігі "гасцявалі" ў Баку